Хлопчык і кацяня

Аўтар: Галіна Здановіч, г. Ваўкавыск
08.07.2018 00:00



Цэлы дзень ліў халодны дождж.

Дзіма вярнуўся дамоў з вуліцы, паабедаў і ўспомніў, што мама прасіла яго схадзіць у магазін.

Каля магазіна знаходзілася летняя прыбудова. І вось недзе адтуль ужо каторы дзень было чуваць голаснае мяўканне ката. Людзі спыняліся і заглядалі пад прыбудову. Дзіма таксама падышоў паглядзець, адкуль даносяцца жаласлівыя гукі. Каля прыбудовы стаялі некалькі жанчын і грузчык. † – Гэты кот, відаць, зашыўся пад падлогу і не можа вылезці, – гаварыў мужчына.

– Дык вызавем ратавальнікаў! – умяшаўся Дзіма.

Ён папрасіў дазволу ў прадаўцоў патэлефанаваць на нумар службы выратавання. Паабяцалі хутка прыехаць. Тым часам Дзіма купіў усё неабходнае і хуценька занёс пакеты дамоў. Жыў ён насупраць магазіна. А калі вярнуўся назад, то ўбачыў, што пад'ехала невялікая машына, а ў ёй – двое мужчын. Яны ўвайшлі ў прыбудову і пачалі прыслухоўвацца.

З-пад падлогі даносіўся ўжо не гучны, а хрыплы піск. Ратавальнікі прыпаднялі дошкі і дасталі адтуль маленькае кацяня. Яно прыціснулася да зямлі, а пасля ўскочыла і рынулася наўцёкі. Але адна з жанчын паспела ўхапіць яго за карк.

– І куды цяпер гэтага няшчаснага? – спытаў адзін з ратавальнікаў. – Ён ізноў залезе ў шчыліну і сканае там у цемры ад голаду і страху.

– Давайце мне, – раптам прапанаваў Дзіма. – У мяне ёсць два каты...

– А гэта кошачка, – з усмешкай заўважыла жанчына.

– Нічога, няхай будзе. Каму-небудзь падару, – упэўнена сказаў хлопчык.

– Мала ахвотных на такія падарункі! – вымавіў нехта з натоўпу. – І чаму толькі людзі

бяруць, а пасля выкідваюць іх, каб памерлі з голаду ці пад коламі машыны?

– А таму што па-сапраўднаму не вераць у Бога! – заўважыў Дзіма.

Хлопчык моцна прыціснуў да грудзей кацяня, якое спярша старалася вырвацца, але хутка суцішылася, і панёс дамоў.

– І навошта табе яшчэ адзін кот? – спытаў сусед, які ішоў насустрач.

– На тое, каб уратаваць яму жыццё. Гэта не папера, што скамячыў, а пасля выкінуў у сметнік, а жывая істота, якая адчувае боль, голад, адзіноту. А абыякавасць да ўсяго жывога – гэта грэх і недобрасумленнасць.